Шукаць

(https://palesse.press/)

(https://

Раёны (https://palesse.press/category.php?slug=areas)

Правы чалавека (https://palesse.press/category.php?slug=hr)

Грамадства (https://palesse.press/category.php?slug=society)

Экалогія (https://palesse.press/category.php?slug=ecology)

Палітыка (https://palesse.press/category.php?slug=policy)

Эканоміка (https://palesse.press/category.php?slug=economy)

Культура (https://palesse.press/category.php?slug=culture)

Спорт (https://palesse.press/category.php?slug=sport)

Беларусь (https://palesse.press/category.php?slug=belarus)

Свет (https://palesse.press/category.php?slug=world)

У Петрыкаве мужчыну прысудзілі два гады абмежавання волі за тое, што крыкнуў непрыстойнае слова на МУСаўцаў, калі яны яго збівалі

Палеская Вясна 10.09.2021

Інцыдэнт, за які асудзілі петрыкоўца, адбыўся ў лістападзе мінулага года. Тады да ягонага брата прыйшлі з пратрусам некалькі карнікаў з мясцовай філіі МУС. Яны шукалі нейкія бензапілы.

Брат патэлефааваў **Дзмітрыю Ляўковічу** і паведаміў, што ў ягоным падворку адбываецца ператрус. Дзмітрый прыехаў і пачаў здымаць тое, што адбываецца ў прыватнай уласнасці брата, на відэакамеру.

Даведка: Згодна з артыкулам 5 лукашысцкага Закона «Аб органах унутраных справаў», дзейнасць органаў унутраных справаў з'яўляецца галоснай, адкрытай для грамадзян і сродкаў масавай інфармацыі ў той меры, у якой гэта не супярэчыць патрабаванням крымінальна-працэсуальнага заканадаўства, заканадаўства, якое вызначае парадак адміністрацыйнага працэсу, заканадаўства аб аператыўна-вышуковай дзейнасці, аб персанальных дадзеных, аб абароне дзяржаўных сакрэтаў, аб інфармацыі, інфарматызацыі і абароне інфармацыі.

Невядома, што такога, за што было б сорамна потым міліцыянтам, яны збіраліся рабіць на падворку Ляўковіча старэйшага, але яны ані не хацелі, каб брат абшукваемага здымаў іхнія, нібыта законныя, дзеянні на відэа. У выніку ўсчалася штурханіна, падчас якой двое карнікаў павалілі Дзмітрыя на зямлю, закруцілі рукі, і адзін з лукашыстаў пачаў з асаблівай жорсткасцю біць яго нагой у галаву, якую той спрабаваў узняць з халоднай лістападаўскай зямлі. Таксама міліцыянты ўжылі да чалавека, які ажыццяўляў сваё права на збор і распаўсюд інфармацыі, пярцовы газ, а той, што збіваў яго, яшчэ і дастаў пісталет і пачаў пагражаць іншым сваякам. Гэта ўсё трапіла, усё ж, на відэа (https://www.youtube.com/watch?v=QB8GEdOBXXo) (*увага, прысутнічае ненарматыўная лексіка!*), якое пазней было змешчана на YouTube-канале Ляўковіча.

Скрын-шоты з відэа, знятага Ляўковічам.

Пасля такога жорсткага затрымання Дзмітрыя Ляўковіча завезлі ў лякарню са страсеннем мазгоў ды мноствам гематомаў. Пасля таго, як ён ачуняў, яго ўлады зняволілі на 15 содняў за непадпарадкаванне міліцыянтам. Увесь тэрмін зняволення ён адбыў.

Сёлета ў жніўні распачаўся суд паводле артыкула 369 Крымінальнага кодэксу. Міліцыянты, якія збілі Дзмітрыя, адчулі сябе абражанымі тым, што падчас збіцця, ён крыкнуў «Адпусціце, п***ры!». Пацярпелымі аказаліся дое супрацоўнікаў карнага органу лукашэнкаўскага рэжыму, якія маюць прозвішчы **Аскерка** і **Сярапін**. Яны звярнуліся ў суд з заявай аб абразе. Акрамя таго, што ім карцела прыцягнуць Ляўковіча да крымінальнай адказнасці, яны яшчэ і запатрабавалі ад яго кампенсацыю маральнай шкоды па 500 рублёў кожны.

Скрын-шот з відэа, знятага Ляўковічам.

Пракурорка Фіцнер запатрабавала для Ляўковіча пакаранне ў выглядзе 1,5 года абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Але ў выніку яму суддзя Федаровіч прысудзіў 2 гады абмежавання волі без накіравання ў ПУАТ.

29.6k
Shares

0 Comments

Login

G

Start the discussion…

LOG IN WITH

OR SIGN UP WITH DISQUS

Name

Share

Best Newest Oldest

Be the first to comment.

Subscribe Privacy Do Not Sell My Data



(http://spring96.org/be)

ПАПУЛЯРНЫЯ НАВІНЫ

У Рэчыцы Дзень маці адзначылі палітычнымі судамі над сям'ю жанчынамі (https://palesse.press/news.php?slug=1205)

Палеская Вясна 14.10.2024

ЗВЯЗАЦЦА З НАМІ

contact@palesse.press

Перадрук і цытаванне матэрыялаў парталу дазваляецца з абавязковай актыўнай індэксуемай гіперспасылкай на сайт palesse.press не ніжэй за другі абзац.